Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Баравікоўская сярэдняя школа”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “УДАСКАНАЛЕННЕ АРФАГРАФІЧНАЙ ПІЛЬНАСЦІ ВУЧНЯЎ V КЛАСА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

Коваль Наталля Васільеўна,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры
+375296086055;
e-mail: nataly1.kiv@gmail.com

## *1 Інфармацыйны блок*

1.1. Назва тэмы вопыту

Удасканаленне арфаграфічнай пільнасці вучняў V класа на ўроках беларускай мовы

1.2. Актуальнасць вопыту

Удасканаленне арфаграфічнай пільнасці – працэс доўгі і шматгранны.

Лічу, што праблема фарміравання граматнага пісьма з'яўляецца адной з найважнейшых у курсе беларускай мовы. Шматгадовая практыка работы ў школе паказала, што існуюць супярэчнасці паміж спосабам засваення моўнага правіла і эфектыўнасцю яго прымянення вучнямі ў працэсе дэманстрацыі сваёй пісьмовай кампетэнцыі.

Ці дастаткова сёння запомніць моўнае правіла, растлумачанае настаўнікам, каб граматна пісаць? Лічу, што не. І прычын тут шмат. Зразумела, што здольнасць знаходзіць у словах месцы, дзе трэба пісаць, карыстаючыся правіламі, павінна закладвацца ў пачатковых класах. Але, на жаль, у перыяд навучання на першай ступені адукацыі ў большасці дзяцей арфаграфічная пільнасць фарміруецца слаба.

Вучні скардзяцца на дрэнную памяць, на перагрузкі, на прабелы ў ведах, набытыя на першай ступені навучання.

Такім чынам, праблема развіцця арфаграфічнай пільнасці з'яўляецца актуальнай, што і вызначыла выбар тэмы майго вопыту.

1.3. Мэта вопыту:

Выяўленне эфектыўных спосабаў фарміравання арфаграфічнай пільнасці вучняў і стварэнне сістэмы практыкаванняў для ўдасканальвання навыку пісьма праз узмацненне практычнай накіраванасці выкладання прадмета.

1.4. Задачы вопыту:

1. Раскрыць змест метадаў і прыёмаў фарміравання арфаграфічнай граматнасці, якія забяспечваюць дадатковы ўзровень падрыхтоўкі вучняў па беларускай мове.

2. Фарміраваць навык распазнавання ўмоў выбару арфаграмы: часціна мовы, частка слова, націск.

3. Вызначыць эфектыўнасць выкарыстаных прыёмаў і метадаў навучання арфаграфіі, сістэмы карэкцыі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў.

4. Садзейнічаць узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў.

5. Выявіць перспектывы развіцця вопыту.

1.5. Працягласць работы над вопытам

Сістэматычная работа па фарміраванні арфаграфічнай пільнасці вучняў вядзецца мною з 2013 года. У ходзе работы было пройдзена некалькі этапаў:

1. Прааналізаваны змест метадычнай літаратуры па выбранай праблеме, вывучаны рэкамендацыі.

2. Зроблены адбор метадаў і прыёмаў па фарміраванні арфаграфічнай граматнасці, распрацавана і апрабіравана сістэма карэкцыйнай работы па арфаграфіі (у V класе).

3. Праведзены параўнальны аналіз узроўню падрыхтоўкі вучняў па фарміраванні арфаграфічнай граматнасці. Зроблены вывады, улічаны недахопы, напісаны рэкамендацыі.

## *2 Апісанне тэхналогіі вопыту*

2.1. Вядучая ідэя вопыту

Сучасная методыка прапануе настаўніку бясконцае мноства сродкаў навучання і самаадукацыі. Але як не згубіцца ў гэтым моры інфармацыі, як дапамагчы вучню атрымаць высокі ўзровень падрыхтоўкі па арфаграфіі?

Даволі вялікі стаж працы настаўнікам, выкладанне беларускай мовы на розных ступенях навучання дазволілі мне распрацаваць сваю метадычную сістэму дзейнасці па фарміраванні арфаграфічнай пільнасці.

Несфарміраваная арфаграфічная граматнасць з’яўляецца асноўнай прычынай таго, што дзеці робяць памылкі.

Прааналізаваўшы розную метадычную літаратуру па тэме, я вызначыла рад умоў, якія ўплываюць на паспяховасць фарміравання арфаграфічнага навыку:

1. Развіццё фанематычнага слыху. Фанематычны слых узнікае ў працэсе маўленчай дзейнасці, у працэсе маўленчых практыкаванняў, а іменна: выразнага чытання, дэкламацыі; спецыяльных практыкаванняў у прагаворванні; утварэння марфалагічных формаў, пабудовы сінтаксічных канструкцый.

2. Развіццё арфаграфічнай пільнасці, якая развіваецца ў працэсе моўнага аналізу і сінтэзу, выдзялення гукаў і літар, марфем. Пры сістэматычнай адпрацоўцы гэтае ўменне аўтаматызуецца і становіцца кампанентам арфаграфічнага навыку, забяспечваючы выяўленне і распазнаванне арфаграм.

3. Разуменне моўных значэнняў, гэта значыць разуменне зместу цэлых выказванняў, сэнсу асобных сказаў, зваротаў маўлення, словазлучэнняў, фразеалагізмаў, а таксама разуменне граматычнага значэння слоў і марфем.

4. Авалоданне комплексам арфаграфічных уменняў:

- ставіць арфаграфічныя задачы, гэта значыць знаходзіць арфаграмы;
- вызначаць тып арфаграмы і адносіць яе да пэўнага правіла, гэта значыць выбраць правіла;
- прымяняць правіла, гэта значыць правільна выканаць алгарытм рашэння арфаграфічнай задачы;
- ажыццяўляць арфаграфічны самакантроль.

5. Выкананне дастатковай колькасці практыкаванняў для аўтаматызацыі арфаграфічных дзеянняў і фарміравання арфаграфічнага навыку.

6. Сістэматычная работа над памылкамі, што садзейнічае актуалізацыі ланцужка правільных ведаў і затармажванню няправільных.

Такім чынам, развіццё арфаграфічнай пільнасці можа выступаць як адна з умоў фарміравання арфаграфічнага навыку і як уменне, якое ўваходзіць у комплекс арфаграфічных уменняў.

2.2. Апісанне сутнасці вопыту

Пачынаючы работу з пяцікласнікамі, на першых уроках я даю паняцце слова “арфаграфія”, робячы акцэнт на тое, што ўтварылася яно з двух слоў грэчаскай мовы: “grapho” – пішу, напісанне; “orthos” – правільны. Пасля гэтага

знаёмлю іх з цікавым, на мой погляд, паняццем арфаграфічнай пільнасці, якое прапанавалі аўтары кнігі “Сакрэты арфаграфіі”:

“Для таго каб граматна пісаць, трэба мець не толькі зоркае вока, але і зоркі розум. Ён дапамагае воку ўбачыць цяжкія месцы ў словах. Пра тых, хто бачыць у слове цяжкія месцы, гавораць, што ў іх ёсць арфаграфічная пільнасць. У чымсьці гэтыя людзі падобныя… на сапраўдных грыбнікоў.

Давайце ўспомнім, як збіраюць грыбы. “Грыбная ўдачлівасць” ва ўсіх розная. Адны варочаюцца з лесу з кошыкамі, донцы якіх ледзь прыкрыты грыбамі, у другіх кошыкі поўныя з верхам.

Гэта “грыбная ўдачлівасць” залежыць ад таго, як людзі збіраюць грыбы. Адны ходзяць па лесе і чакаюць, калі грыбы трапяцца ім на вочы. На іх шляху вялікая колькасць грыбоў застанецца незаўважанай. Другія старанна абшнырваюць кожны квадратны метр зямлі. Яны таксама збяруць не шмат грыбоў, так як затрацяць дарэмна немалую частку часу.

А трэція? Трэція ведаюць, дзе любяць расці грыбы. І яны знаходзяць іх лёгка і хутка. “Грыбное шчасце” ім усміхаецца. Тым, хто хоча пісаць граматна, трэба ведаць “грыбныя месцы” для памылак [2, с. 58].

Пасля такога параўнання ўсе вучні жадаюць аднесці сябе да трэцяй групы і навучыцца лёгка знаходзіць “грыбныя месцы”, разумеючы, што ў будучым, калі яны жадаюць быць адукаванымі людзьмі, ім спатрэбіцца арфаграфічная граматнасць.

У пачатку навучальнага года я заводжу сшытак дзіцячых памылак. У ім на кожнага вучня адводжу некалькі старонак. Пасля пісьмовых работ (класных, дамашніх, кантрольных) выпісваю памылкі, якія вучні дапусцілі. Паступова запіс папаўняецца. Па меры назапашвання памылак складаю карткі, у якія запісваю словы з памылкамі, якія вучні дапусцілі ў сваіх работах. Карткі гэтыя імянныя, але працаваць па іх могуць усе вучні. Змест гэтых картак іншы раз выкарыстоўваю для слоўнікавага дыктанту. Работа па картках працягваецца да таго часу, пакуль вучань перастане рабіць памылкі ў дадзеных словах. Вось прыклад такіх картак:

1. Выпішыце ў два слупкі словы з літарамі э і е.

Акард...он, акс...суар, , бер...т, ат...лье, б...жавы, бізн...с, ген...тыка, энерг...тычны, брун...т, д...баты, шымпанз... .

Д...прэсія, б...йдж, каф..., ін...рцыя, мауз...р, кар..., куп..., л...дзі, маян...з, п...псі-кола, карат... .

Праф...сіянал, прэз...нтацыя, рэзюм..., рэп...ртуар, с...рвіс, філ..., экз...мпляр, эксп...рымент, экспр...с, тун...ль, камюнік..., эс..., ж...ле.

З першых урокаў прывучаю дзяцей выконваць работу над памылкамі, якія былі імі зроблены ў класных і дамашніх работах на правілы ўжо вядомыя ім. Гэта актывізуе разумовую дзейнасць.

Адным з момантаў ва ўдасканальванні арфаграфічнай пільнасці вучняў лічу фарміраванне паняцця аб арфаграме. Гэта, на мой погляд, яшчэ адна пачатковая прыступка на шляху навучання правапісу.

Галоўная мая задача – навучыць вучняў бачыць вывучаную арфаграму, умець правільна называць яе і прыводзіць свае прыклады. Пагэтаму рэгулярна праводжу праверачны дыктант з абавязковым каменціраваннем, у выніку чаго, пяцікласнікі вучацца ўспрымаць арфаграмы на слых, знаходзіць слабыя пазіцыі ў слове, суадносіць арфаграму з правілам.

Фарміруючы навык граматнага пісьма, вучу дзяцей ставіць на ўроку арфаграфічныя задачы.

Адным з першых спосабы фарміравання ўменняў ставіць арфаграфічныя задачы пачаў распрацоўваць у 60-х гадах А.І. Кобызеў. Ён прапанаваў дыктант “Правяраю сябе”, які цудоўна працуе і сёння. У час гэтага дыктанта дазваляецца прапускаць літару, у якой сумняваешся, вучні могуць задаць пытанні, звярнуцца да справачнай літаратуры і запоўніць пропуск або ўнесці выпраўленні [3].

Я лічу, галоўным дасягненнем гэтай методыкі з’яўляецца тое, што вучні шукаюць цяжкія для іх арфаграмы не пасля запісу, а ў момант перакладу вуснага маўлення ў яе пісьмовую форму.

Гэты спосаб дапамагае выканаць найбольш дзейнаснае і адначасова найбольш складанае з практыкаванняў, якое выхоўвае арфаграфічную пільнасць, а іменна: пісьмо з пропускамі арфаграм, або, як яго называюць, пісьмо "з дыркамі". Вучням пры выкананні розных пісьмовых работ на доўгі час дазваляецца прапускаць літару, калі яны сумняваюцца або не ведаюць, якую літару неабходна напісаць.

Гэта вызваляе вучня ад страху дапусціць памылкі, папярэджвае няправільнае напісанне, дазваляе ўсвядомлена падыходзіць да знаходжання арфаграм.

Такім чынам, уключаючы дзяцей у дадзены від дзейнасці, мы прывучаем да самастойнасці іх арфаграфічнага мыслення, у іх выпрацоўваецца "арфаграфічная ўвага", вучні бачаць свае магчымыя памылкі.

У працэсе авалодання вучнямі арфаграфічнага навыку паляпшаецца арфаграфічны самакантроль. Існуе мноства прыёмаў фарміравання арфаграфічнага самакантролю, але найбольш эфектыўнымі я лічу наступныя:

1. Арфаграфічнае прагаворванне. Асабліва эфектыўна паскладовае прагаворванне пры праверцы спісвання, калі яно суправаждаецца падкрэсліваннем кожнага прачытанага складу дужкай [4]. Прачытаць слова "як напісана" – гэта значыць прагаварыць яго арфаграфічна. Такі спосаб чытання называюць прагаворваннем. Іменна арфаграфічнае паскладовае прагаворванне дапамагае дзецям пазбегнуць тыповых памылак.

2. Работа з "Арфаграфічным даведнікам", які пяцікласнікі вядуць з маёй дапамогай на ўроку і самастойна дома. Сутнасць афармлення даведніка заключаецца ў тым, што комплекс алгарытмаў, якія дапамагаюць узнавіць правіла, паступова папаўняецца, свае запісы лягчэй успрымаюцца. Даведнікам можна карыстацца, працуючы каля дошкі і перад праверачнай работай па тэме.

3. Какаграфічныя практыкаванні. Практыкаванне "Карэктар" у знаходжанні і выпраўленні спецыяльна дапушчаных памылак, безумоўна, садзейнічае развіццю самакантролю. Малодшыя вучні вельмі ахвотна выконваюць заданні па выпраўленні "чужых" памылак. Але пачынаць трэба з

калектыўнай работы пад кіраўніцтвам настаўніка. Толькі пасля таго, як дзеці авалодалі дадзеным прыёмам работы, яны змогуць самастойна знаходзіць і выпраўляць у тэксце памылкі. На ўроках выкарыстоўваем карткі з надрукаванымі какаграфічнымі тэкстамі. Дзеці не толькі павінны знайсці і выправіць памылкі, але і вызначыць від памылкі, размеркаваць словы, у якіх яны дапушчаны, у патрэбны слупок і ацаніць сябе. Напрыклад, можна выкарыстаць наступныя прыёмы:

Прыём 1. Какаграфічнае практыкаванне «Карэктар».

Заданне:  знайдзіце і выпраўце памылкі ў словах.

*Увага! Паважаныя пецікласнікі, гэтай весной вы можаце убачыць новы спяктакль Медведзік – гярой або лясніковыя нататкі. Усе ролі выконваюць вучні дзесятага класа, а мялодыі – вучні девятага класа. Прыхотте!*

Вашай увазе хачу прадставіць яшчэ і дзелавую гульню “Карэктар”. Так як гэта вучні V класа, ім вельмі падабаецца гуляць на ўроку.

Прыём 2. Вы настаўнікі, вучні здалі вам свае пісьмовыя работы. Ваша задача – праверыць работы, выставіць адзнакі (за адну памылку зніжаецца адзнака на 1 бал: 1 памылка – “8”, 2 памылкі – “7” і гэтак далей).

*Работа вучня Акімчанка Міхаіла Васільевіча.*

стаялі пагодные дні. Днём было яшчэ цёпла, а пад вечар зямля стыла на холаде. Сонца грэла мала, але лагодна і пяшчотна. “Шкада развітвацца з летам, праўда бабуля?” – сказала ціха ганначка.

*Работа вучня Бачанцавай Аліны Іванаўны.*

Мікола падумаў:”Як хораша жіць!” Цеплыня, свет і дабрыня нібы разліліся па усім свеце пасля гэтай страшнай навальніцы. Дразды, сіваваронкі, салаўі і сойкі – усе птушкі ажылі і прыветна заспевалі.

*Работа вучня Варанцовай Юліі Генадзьеўны.*

Быццам хто перавярнул велікае ведро вады, так паліў дожч на гэты восеньскі лес. Вецяр ламаў галінкі, зрываў апошнее лісце, збіваў з нох дзве постаці. Схавалася ўсё жывое.

Прыём 3. Верным дапаможнікам карэктара з’яўляецца слоўнік. З дапамогай слоўніка праверце напісанне наступных слоў:

Г…рань, зав..зь, п…чатка, ан…кдот, м…деза, дз…журны, дз…вяць, дз…вятка, к…фір, він…грэт, с…анс, л…мантаваць.

Дадзеныя прыёмы і практыкаванні па фарміраванні навыку самакантролю ўзмацняюць адказнасць у вучняў пры выкананні заданняў, прывучаюць іх працаваць без памылак, а пры выяўленні – тут жа іх выпраўляць, актывізуюць працэс навучання, абуджаюць цікавасць да заняткаў.

Эфектыўным спосабам фарміравання арфаграфічнай граматнасці лічу выкарыстанне на ўроку розных відаў картак:

1. “Будзь уважлівым!”: выбарачны дыктант “Правапіс мяккага знака”: першы варыянт выпісвае словы з мяккім знакам, другі варыянт – без мяккага знака.

Галлё, ледзьве, сем, пісьменнік, агеньчык, дзверы, конскі,чэрвеньскі, мітусня, восеньскі, дзевяццю, дзецьмі, лімончык, песня, крочце, едзьце, вагончык, пенальчык, яблынька, большы, забудзьце, дзесьці,счарсцвець, разьбяр, зацвісці, пяцьдзясят.

2. Запішыце прапанаваныя словы па-беларуску. З трыма з іх (на выбар) складзіце сказы.

Бухгалтер, принтер, фломастер, леснік, блокбастер, свитер, легенда, Ольстер, катер, девятый, семнадцать.

3. “Успомні слова па дадзенай арфаграме”. Кожнаму вучню даю картку, на якой напісана назва арфаграмы. За 2-3 хвіліны яны запісваюць як мага больш слоў, якія адпавядаюць дадзенай арфаграме. Характар спаборніцтва ў дадзеным заданні мае элемент гульні, што, несумненна, па душы пяцікласнікам.

Напрыклад, “Правапіс у, ў (нескладовага)”.

4. “Арфаграфічнае лато” . Пры падагульненні і сістэматызацыі ведаў па пройдзеным арфаграфічным правіле прыём “арфаграфічнае лато” лічу вельмі дзейнасным сродкам, так як гэта яшчэ і гульнёвая сітуацыя, што вельмі падабаецца пяцікласнікам. Клас дзеліцца на дзве групы, адна група атрымоўвае

карткі з пытаннямі, а другая – з адказамі. Неабходна знайсці на кожнае пытанне правільны адказ і аб'яднацца. Вучням раздаюцца карткі з прапановай знайсці ў іх сваю пару, растлумачыўшы правапіс прапушчаных літар:

а) помнік у выглядзе звужанага ўверсе, звычайна гранёнага каменнага слупа (Аб…ліск). Бадз..ры, жыццярадасны настрой (Аптымізм). Спрэчка (Д…скусія). Літаратурны твор у форме запісак аб мінулых падзеях, удзельнікам або сучаснікам якіх быў аўтар (М…муары). Невялікі рэстаран, дзе прадаюць закускі, кофе, чай, прахладжальныя напіткі ( Каф…).

б) Хто без навукі, (той б…зрукі). Салаўя п…снямі (не накорміш). Шануй людзей, (то і ц…бе пашануюць). Якая птушка, (такое і гн…здзечка). Родная з…мелька – (як зморанаму пасцелька).

Галоўная мэта ў маёй работе не прымушаць, а зацікавіць. Сур'ёзнае навучанне становіцца займальным і цікавым.

Такім чынам, сістэматычная і мэтанакіраваная работа па фарміраванні навыкаў самакантролю аказвае дадатковы ўплыў на засваенне ведаў, уменняў і навыкаў, прадугледжаных праграмай, павышае матывацыю, актывізуе ўвагу вучняў.

2.3 Выніковасць і эфектыўнасць вопыту




Асноўнымі параметрамі выніковасці педагагічнай дзейнасці па дадзенаму вопыту з'яўляюцца: устойлівая пазнавальная цікавасць вучняў да прадмета; станоўчая дынаміка ўзроўню навучанасці; якасная дынаміка матывацыі вучэбнай дзейнасці. Павялічылася колькасць вучняў V класа, якія атрымалі 25% адзнак на высокім ўзроўні за паказчыкі сфарміраванасці арфаграфічнай граматнасці. Такім чынам, спалучэнне разнастайных формаў і прыёмаў пры

правядзенні заняткаў па афаграфіі дазволіла мне павысіць станоўчую матывацыю пяцікласнікаў да вывучэння беларускай мовы і, як вынік, іх узровень навучанасці. Вось, напрыклад:

Хачу адзначыць выніковы ўдзел маіх вучняў у II этапе рэспубліканскай алімпіяды (на 15% у 2016/2017 годзе больш чым у папярэдніх). Гэта бачна ў дадзенай табліцы:

| 2012/2013 | 2013/2014 | 2014/2015 | 2015/2016 | 2016/2017 |
|---|---|---|---|---|
| Д3 | Д2 | Д3 | Д2 | Д1, Д3 |

Мае вучні пастаянна ўдзельнічаюць у дыягнастычным тэсціраванні, у конкурсе “Буслік”.

Лепшыя вынікі:

| “Буслік -2014” | “Буслік -2015” | “Буслік -2016” | “Буслік -2017” |
|---|---|---|---|
| Прыз 3 | Прыз 3(2) | Прыз 3 (2) | Прыз 3 (3) |

### *3 Заключэнне*

3.1. Канкрэтныя высновы і прапановы, якія вынікаюць з вопыту

Сістэматычная работа, заснаваная на выкарыстанні эфектыўных прыёмаў і сродкаў фарміравання арфаграфічнай пільнасці, дае станоўчыя вынікі:

- дазваляе своечасова выявіць прабелы і комплексна ліквідаваць іх;
- павышаецца ацэнка ведаў вучняў па прадмеце, што спрыяе іх унутранай матывацыі да вывучэння беларускай мовы;
- асэнсоўваючы свае здольнасці, з’яўляюцца вучні, якія жадаюць наведваць факультатыўныя заняткі па прадмеце, удзельнічаць у розных конкурсах і алімпіядах па беларускай мове;
- узрастае ўзровень дысцыплінаванасці навучэнцаў, узнікае натуральная патрэба быць уважлівымі і сканцэнтраванымі на ўроку;
- навучэнцы пацверджваюць свае гадавыя адзнакі на выніковай атэстацыі. Іх старанні дапамагаюць ім упэўнена адчуваць сябе на цэнтралізаваным тэсціраванні.

3.2. Перспектыва далейшага ўдасканалення дадзенага вопыту і сваёй прафесійнай практыкі.

Планую дадзены вопыт удасканальваць: прадоўжыць падбор практычнага матэрыялу для заняткаў беларускай мовы, выкарыстоўваць як мага больш метадаў і прыёмаў для фарміравання арфаграфічнай пільнасці ў вучняў VII-X класаў.

3.3. Рэкамендацыі па выкарыстанні педагагічнага вопыту ў дзейнасці іншых педагогаў, магчымасці яго прымянення ў масавай практыцы.

Лічу, што прадстаўлены практычны матэрыял мэтазгодна выкарыстоўваць у рабоце настаўнікаў беларускай мовы агульнаадукацыйных школ на розных этапах урока з мэтай фарміравання арфаграфічнай граматнасці вучняў, пры падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага тэсціравання.

3.4. Уласныя артыкулы, выступленні з дадзеным вопытам у педагагічных аўдыторыях.

Абагулены вопыт распаўсюджваецца мною сярод педагогаў сваёй установы адукацыі на паседжаннях школьнага метадычнага аб'яднання настаўнікаў гуманітарнага цыкла па тэме “Удасканаленне арфаграфічнай пільнасці вучняў па беларускай мове” ў снежні 2015 года, а таксама з гэтай жа тэмай на педагагічным савеце ўстановы адукацыі ў студзені 2016 года. Таксама мною быў праведзены адкрыты ўрок для маладых педагогаў школы “Фарміраванне арфаграфічнай пільнасці. Правапіс зычных д-т, т-ц” у V класе.

Матэрыялы з вопыту размешчаны на сайце ўстановы адукацыі ў раздзеле “Метадычная скарбонка”.

Станоўчыя вынікі вопыту сведчаць аб неабходнасці далейшай работы ў дадзеным накірунку: пашырэнне банка дадзеных арфаграфічных трэнажораў, хвілінак, тэставых заданняў; стварэнне камп'ютарных рознаўзроўневых заданняў па арфаграфіі; распаўсюджванне ўласных метадычных распрацовак праз публікацыі ў навукова-метадычных часопісах і газетах.

Спіс літаратуры:

1. Баршчэўская, А.Л. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / Аўт. - склад. А.Л. Баршчэўская, Л.П. Баршчэўскі. – Мінск : Радыёла-плюс, 2010. – 560 с.

2. Граник, Г.Г. Секреты орфографии. / Г.Г. Граник, С.М. Бондаренко, Л.А. Концевая – М. : Просвещение, 1991. – 222 с.

3. Савинова, З.А. Виды работ по формированию орфографической зоркости // Начальная школа. –1996. – №1. – С. 53.

4. Куліковіч, У.І. Вучымся пісаць па-новаму: вучэбны дапаможнік па беларускай арфаграфіі / У.І. Куліковіч. – Мінск : Беларус. асац. «Конкурс», 2009. – 144 с.

Дадатак 1

Урок беларускай мовы ў V класе.

Тэма: Правапіс галосных е,ё,я

Мэта: Знаёмства з правапісам галосных е,ё,я.

Задачы: Садзейнічаць засваенню правілаў вымаўлення і напісання галосных е,ё,я ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах. Удасканальваць уменне вызначаць націскны, першы і другі пераднаціскныя, паслянаціскныя склады, адрозніваць каранёвае я, словы іншамоўнага паходжання. Вучыць ужываць новыя словы ў вусным і пісьмовым маўленні. Спрыяць развіццю ўважлівасці, памяці, умення працаваць у парах. Выхоўваць культуру паводзін падчас працы ў групах, павагу адзін да аднаго.

Ход урока

I. Арганізацыйны момант.

Настаўнік. Калі я падышла да дзвярэй класа, то ўбачыла гэты канверт, на якім напісана "Угадай літару". Давайце яго раскрыем і даведаемся, што мы павінны ўгадаць.

Заданне: пра якую галосную літару ідзе размова?

1) Гэта літара з'явілася ў беларускіх тэкстах у канцы XIVстагоддзя, само яе з'яўленне ў нашай мове звязана з запазычаннем;

2) У іншых сучасных славянскіх кірылічных алфавітах яна не выкарыстоўваецца;

3) Сёння ў спрадвечна беларускіх словах пішацца пад націскам, падлягае закону акання (Літара Э).

Прывядзіце прыклады. (Стрэхі – страха, шэры – шарэць).

Чаму ўрок пачаўся з гэтага задання? (Бо на мінулым уроку вывучалі тэму "Правапіс о,э,а")

II. Праверка дамашняга задання.

Устаўце прапушчаныя літары. Калі ўпэўнены, што правільна напісалі, пастаўце над словам "+".

Ж…мчуг, ж…мчужына, галантар…я, тен…ль, шніц…ль, лід…р, г…лас, г…ласісты, карат…, фламаст…р.

Прыём “Арфаграфічнае лато” Назавіце адным словам: адбіўная ці рубленая катлета (шніц…ль); скразны калідор, прабіты ў гарах або пракапаны пад зямлёй (тун…ль); каштоўнае перламутравае рэчыва ў форме зярнят, якое здабываюць з ракавін некаторых малюскаў(ж…мчуг); дробныя прыналежнасці ўбору (галантар…я). (Словы з задання).

III. Паведамленне тэмы, мэты, задач урока.

Тэма сённяшняга ўрока " Правапіс галосных е,ё,я”.

Стварэнне праблемнай сітуацыі. Гульня “Як называецца дзіця?”

Вавёрка, лось, мядзведзь, карова, ліса, цецярук.

Настаўнік: падзяліце ўтвораныя словы на склады, пастаўце націск, абазначце склады перад націскам.

Зрабіце вывад. (У першым складзе перад націскам пішам я.)

3 2 1 / 2 1 / 3 2 1 / 1 / 2 1 / 4 3 2 1 /

Адказ. Ва-вер-ча-ня, ла-ся-ня, медз-ве-дзя-ня, ця-ля, лі-ся-ня, це-це-ру-ча-ня.

Скажыце, калі ласка, якія задачы стаяць сёння перад намі? (Вучні адказваюць ( пасля таго, як дзеці паспрабавалі вызначыць задачы ўрока, я паказваю ім задачы, запісаныя на дошцы. Запіс будзе ўвесь час перад вачыма вучняў, а напрыканцы мы зноў да яго звернемся).

IV.Фізкультхвілінка.

А зараз, дзеці, усе ўсталі,
Хутка рукі ўверх паднялі,
Пацягнуліся,
сонцу ўсміхнуліся.
Промні засвяціліся,
Рукі апусціліся.
Павярнуліся ўлева,
Павярнуліся ўправа,
Ціха селі
Зноў за справу.

V. Азнаямленне з новым матэтыялам.

1. Чытанне лінгвістычнага матэрыялу ў вучэбным дапаможніку (Параграф 35, с. 147-148) і складанне апорных схем.

1 / 2 1 /

1) Е-Я: лес-л**я**снік, Е застаецца: лесніковы;

2) Я каранёвае: за**я**ц, сув**я**зь, мес**я**ц;

3) Я ў суфіксах: дроб**я**зь, се**я**ць;

4) Пасля г,к,х у запазычаных словах пішацца Е.

5) Запомні:

Г**е**рой, м**е**даль, п**е**нал, з**е**фір,

бензін, педаль, гепард, кефір,

с**е**кунда, б**е**гемот, б**е**тон,

б**е**рэт, л**е**генда, ф**е**льетон,

г**е**рань, ф**е**номен,ваз**е**лін,

г**е**ктар, с**е**анс і ап**е**льсін.

2. Цікава ведаць.

- Калі вы не паставілі кропкі над ё, то гэта будзе памылкай.

- У 2005 годзе пастаўлены помнік гэтай літары (у Расіі).

- Згодна з новай рэдакцыяй "Правіл арфаграфіі" ё пішацца і не пад націскам у словах з коранем ёд-, ёт-: ёдапірын, ётаваны.

- Напісанне радыё-(выпраменьваю, выпускаю промні): радыёантэна; радые (хімічны элемент): радыеактыўны – радыяхімія.

3. Праца з вучэбным дапаможнікам: пр.262

Дапаўненне апорнай схемы на правапіс е, я ў запазычаных словах (пункты 4,5) .

Пастаўце ў словах націск. Ці залежыць напісанне галоснай е ад месца націску? (Не).

VI. Замацаванне вывучанага матэрыялу.

1. Работа ў парах. Кожная пара атрымлівае заданне, дзе патрэбна ўставіць прапушчаныя літары, растлумачыць значэнне падкрэсленага слова.

1) Дз…сяць – дз…с…ты, дз…с…тка, <u>дз…с…ціна</u>;

2) б…раг – б…рагавы, прыб…рэжны, б…ражок;

3) в…цер – в…траны, в…трыска, <u>в…тракі</u>;

4) п…сня – п…сняр, п…сняры, пес…ннік.

2. Выкананне пр. 263. Пераклад з рускай мовы на беларускую. Адзін

вучань выконвае на дошцы, а астатнія ў сшытках.

3. Індывідуальная работа.

Устаўце Е ці Я, праверце па арфаграфічным слоўніку.

Г…рань, зав..зь, п…чатка, ан…кдот, м…деза, дз…журны, дз…вяць, дз…вятка, к…фір, він…грэт, с…анс, л…мантаваць.

Заданне класу: запішыце сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор, растлумачце правапіс слоў.

Цудоўны пейзажны малюнак вучні ўбачылі з акна свайго класа.

Пейзаж, -у і –а.

1) -у. Агульны выгляд якой-небудзь мясцовасці, краявід.

2) -а. Малюнак краявіду.

3) -а. Адзін з жанраў мастацкага жывапісу.

Назавіце ў гэтым слове галосныя літары, гукі.

Калі Е абазначае два гукі?

Запішыце транскрыпцыю слова “пейзажны”. Ці супадае колькасць гукаў і літар?.

Праверка індывідуальнага задання.

VII. Падагульненне . Рознаўзроўневыя заданні.

1. Падбярыце словы, каб е,ё перашло ў я.

Мёд, пеня, цёмны, зелень, зерне.

2. Напісанне галосных у запазычаных словах вызначаецца па …(слоўніку).

3. Прыём “Будзь уважлівым!” Выпішыце ў адзін слупок словы, у якіх трэба ўставіць літару е, а ў другі – літару я.

З…фір, дроб…зь, дз…сятка, кал…ндар, св…ткаваць, с…рыял, в…чоркі, м…лодыя, по…зд, сн…гавік.

4. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.

Весёлый сентябрь, новый лесник, красивый гербарий, высокий обелиск, весенний день.

5. Прыём “Арфаграфічнае лата”. Запішыце адным словам.

1) Установа, якая ставіць спектаклі –

2) Міфічны герой, які жыве ў лесе –

3) Нажны рычаг у веласіпедзе –

4) Знак, якім узнагароджваюцца за баявыя заслугі –

5) Дрэва, якое адрозніваецца ад іншых колерам кары –

Праверка выканання задання (адказы запісаны на дошцы).

1. Мядок, пянёк, цямнець, зялёны, зярняты.

2. Арфаграфічным.

3. Зефір, дробязь, дзясятка, каляндар, святкаваць, вячоркі.

4. Вясёлы верасень, новы ляснік, прыгожы гербарый, высокі абеліск, вясенні дзень.

5. Тэатр, лясун, педаль, медаль, бяроза.

VIII. Рэфлексія. Прыём “Лесвіца”

Размяркуйце свае ўражанні ад урока на нашай лесвіцы (у дзяцей на сталах сонейкі):

гэта я хачу ведаць лепш

аб гэтым я даведаўся сёння

гэта я ведаў раней

IX. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.

Складзіце слова.

а, ы, ц, м, а, й, л

X. Дамашняе заданне: параграф 35, пр.264. Неабходна з дадзенымі словамі скласці і запісаць сказы. У атрыманых сказах падкрэсліць дзейнік і выказнік.